# МАЯ ВЁСКА

Мой родны кут,
Як ты мне мілы!
Забыць цябе
Не маю сілы!

Я. Колас.

Мой родны кут — мая вёска Баханы. Якая ж ты прыгожая на самой справе! Чаму я раней не заўважала сваёй прыгажосці? Свой скарб ты, пэўна, адчыняеш переда мною з гадамі. З узростам я ўсё мацней і мацней пачынаю кахаць цябе. Мяне ўсё больш пачынае прываблiваць твой блакіт рэчкі, якая шырокай стужкай звіваецца з аднаго боку, а асфальтаваная страла шашы — з другога. Яны, нібыта дзве пяшчотныя рукі, засланяюць цябе ад нябачных ворагаў.

Амаль ад самай рэчкі да лесу раскінуўся заліўны луг. Далей — высокі сасновы бор. А саму ж цябе, вёска мая, можна параўнаць з ганарлівaю царыцай, якая ўзвышаецца над маляўнічымі мясцінамі.

Ты стаіш на ўзгорку, грозна наглядаючы за жыццём навокал цябе. Але і ўнутры цябе таксама ідзе жыццё сваёй чаргой. Ты маеш нібыта як два цэнтры, якія злучаюцца асфальтаванай стужкай дарогі. У першым цэнтры пабудаваны магазін. У скверыку з ліп — сельскі Дом культуры і ашчадная каса.

Дом культуры ў нас новы, вялікі, утульны. У ім знаходзяцца кіназала з кінаапаратнай, танцпляцоўка, вялікі пакой для артыстаў.

Побач жа размешчаны і будынак праўлення мясцовага калгаса «Чырвоны маяк». Невялікае цаглянае памяшканне. А крыху далей нібы прытаіўся дзіцячы садок. Гэта таксама цаглянае, новае, з вялікімі пакоямі памяшканне. Па адзін бок ад яго — ліпавая алея, па другі — арэлі, турнікі.

У другім цэнтры размешчаны: вузел сувязі, сельскі Савет, сельская бібліятэка. Сельскі Савет у нас адзін на чатыры вёскі. Сельская бібліятэка — вельмі каштоўная пабудова, тут можна знайсці шмат цікавых кніжак.

І самае галоўнае — сярэдняя школа з усімі сваімі пабудовамі. Новая, цаглянная, двухпавярховая. Пры школе маюцца: сталовая, актавая і спартыўная залы, школьная бібліятэка, майстэрня, інтэрнат, у якім пражываюць дзеці з іншых вёсак.

А вы ведаеце, чаго наша вёска мае два цэнтры? Як бы ўмоўна, маленькая рэчка Чачавец падзяляе маю вёску на дзве часткі — новыя і старыя Баханы. Старыя, дзе знаходзяцца сельская бібліятэка, Савет, а новыя — дзе праўленне калгаса, дзіцячы садок.

Мая вёска даволі вялікая, у ёй пражываюць 597 чалавек, і ўсе мы моцна кахаем цябе. Я гавару ад імя ўсіх таму, што дакладна ведаю гэта. Не пакахаць такую прыгажосць нельга. А я буду кахаць і праслаўляць цябе вечна, пакуль не згасне сонца ў вачах.

**Н. КАСЦЮШКІНА,**
**вучаніца 7-га класа**
**Бахаsuccesоўскай СШ.**

**Касцюшкіна, Н.** Мая вёска / Н. Касцюшкіна // Шлях Кастрычніка. — 1998. — 18 красавіка. — С. 3.

*Вёска Баханы, Хоцімскага раёна.*